жр 3196 07/198
Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ! | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# БОЛЬШЭВІК

Орган Капаткевіцкага РК КП(б)Б
№ 10 (752) | Субота, 5 чэрвеня | 1943 г.

**Неабходна знішчыць усіх нямецкіх акупантаў да адзінага, якія прабраліся на нашу радзіму для яе заняволення.**

**І. СТАЛІН.**

# АДКАЗ ТАВАРЫША І. В. СТАЛІНА

## на пытанне галоўнага карэспандэнта англійскага агенцтва Рэйтэр

Маскоўскі карэспандэнт англійскага агенцтва Рэйтэр пан Кінг звярнуўся да Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша І. В. Сталіна з пісьмом, у якім ён прасіў адказаць на пытанне, якое цікавіць англійскую грамадскасць.

Таварыш І. В. Сталін адказаў пану Кінгу наступным пісьмом:

Пан Кінг!

Я атрымаў ад Вас просьбу адказаць на пытанне, якое датычыцца роспуску Комуністычнага Інтэрнацыянала.

Пасылаю Вам свой адказ.

ПЫТАННЕ: „Брытанскія каментарыі па поваду рашэння аб ліквідацыі Комінтэрна былі даволі благапрыятнымі. Які совецкі пункт погляду на гэта пытанне і на яго ўплыў на будучыню міжнародных адносін?“

АДКАЗ. Роспуск Комуністычнага Інтэрнацыянала з'яўляецца правільным і своечасовым, так як ён аблягчае арганізацыю агульнага націска ўсіх свабодалюбівых нацый супроць агульнага ворага — гітлерызма. Роспуск Комуністычнага Інтэрнацыянала правільны, так як:

а) Ён выкрывае хлусню гітлераўцаў аб тым, што „Масква“ быццам-бы намерана ўмешвацца ў справы другіх дзяржаў і „бальшавізіраваць“ іх. Гэтай хлусні зараз кладзецца канец.

б) Ён выкрывае паклёп праціўнікаў комунізма ў рабочым руху аб тым, што комуністычныя партыі розных краін дзейнічаюць быццам-бы не ў інтарэсах свайго народа, а па загаду зне. Гэтаму паклёпу зараз таксама кладзецца канец.

в) Ён аблягчае работу патрыётаў свабодалюбівых краін па аб'яднанню прагрэсіўных сіл сваёй краіны, незалежна ад іх партыйнасці і рэлігійных перакананняў, у адзіны нацыянальна-вызваленчы лагер, — для разгортвання барацьбы супроць фашызма.

г) Ён аблягчае работу патрыётаў усіх краін па аб'яднанню ўсіх свабодалюбівых народаў у адзіны міжнародны лагер для барацьбы супроць пагроз сусветнага панавання гітлерызма, расчышчаючы тым самым шлях для арганізацыі ў будучым садружаства народаў на аснове іх роўнапраўя.

Я думаю, што ўсе гэтыя абставіны, узятыя разам, прывядуць да далейшага ўмацавання адзінага фронта саюзнікаў і другіх аб'яднаных нацый у іх барацьбе за перамогу над гітлераўскай тыраніяй.

Я лічу, што роспуск Комуністычнага Інтэрнацыянала з'яўляецца ўпаўне своечасовым, так як іменна цяпер, калі фашысцкі звер напрагае свае апошнія сілы, — неабходна арганізаваць агульны націск свабодалюбівых краін для таго, каб дабіць гэтага звера і пазбавіць народы ад фашысцкага гнёту.

З пашанаю **І. СТАЛІН**

28 мая 1943 г.

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

### На моры

У Чорным моры нашымі караблямі патоплены падводная лодка і танкер праціўніка. У Баранцавым моры нашымі караблямі і авіяцыяй патоплены транспарт, тральшчык і 2 старажавых катэры праціўніка. У Фінскай затоцы нашай авіяцыяй патоплены транспарт і буксір праціўніка.

### На Калінінскім фронце

На адным участку Калінінскага фронта нашы падраздзяленні атакавалі сільна ўмацаваныя пазіцыі праціўніка. Нашы байцы знішчылі 18 дзотаў, 9 бліндажоў, 13 кулямётаў, 3 мінамёты, склад боепрыпасаў і склад з абмундзіраваннем. У гэтым баю немцы страцілі забітымі і параненымі да 200 салдат і афіцэраў. Захоплены трафеі і палонныя.

### У раёне Лісічанска

У раёне Лісічанска нямецкі разведвальны атрад імкнуўся на лодках пераправіцца на левы бераг ракі Паўночны Данец. Калі лодкі дасягнулі сярэдзіны ракі, нашы байцы адкрылі ружэйна-кулямётны агонь і знішчылі ўсіх гітлераўцаў.

## З Савецкай Радзімы

У вызваленай сталіцы Карачая — Мікаян-Шахары адноўлен і пачаў працаваць разбураны нямецкімі акупантамі радыёвузел. Ідзе рамонт радыёўстановак у жылых памяшканнях.

* * *

Калгасы Архангельскай вобласці засеялі ў фонд абароны і дапамогі калгасам, якія пацярпелі ад нямецкіх захопнікаў, 1800 гектараў.

## Буйны налёт нашай авіяцыі на чыгуначны вузел Орол

У ноч на 4 чэрвеня наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла масіраваны налёт на чыгуначны вузел Орол і прымыкаючыя да яго пункты. У налёце ўдзельнічалі 520 нашых самалётаў. У выніку разбуральнай бамбардыроўкі чыгуначнага вузла ўзнікла агромная колькасць пажараў. Усе нашы самалёты, акрамя аднаго, вярнуліся на свае базы.

# Зробім усе дарогі і сцежкі непраходнымі для немцаў

## Аляксей і яго таварышы

Заслужанай павагай карыстаецца ў атрадзе тав. Ф. група камсамольцаў—падрыўнікоў у саставе Аляксея, Сяргея і Нікалая. Камандзір групы Аляксей стаў сапраўдным майстрам сваёй справы. Ён добра вывучыў усе метады барацьбы з фашысцкімі эшалонамі і ўмела іх прымяняе.

Нядаўна падрыўнікі адправіліся на чыгунку. Падыйсці зараней для таго, каб залажыць міну, нельга было. Немцы паставілі ўзмоцненую ахову, якая хадзіла па шляху туды і назад і пільна ўглядалася ва ўсе бакі. Але няма ніякіх перашкод для патрыётаў Радзімы. Аляксей рашыў перахітрыць фрыцаў.

Набліжаўся цягнік. Нямецкая ахова парашыла, што ніякай небяспекі няма, і адышла. У гэты час адважныя камсамольцы маланкава палажылі міну. Толькі паспелі яны адскочыць, як раздаўся велізарны выбух. Эшалон паляцеў пад адкос. Моцна быў пашкоджан паравоз, разбіта 2 платформы з аўтамашынамі і 2 вагоны з жывой сілай.

Доўга стралялі збянтэжаныя гітлераўцы з сваіх дзотаў па нашым падрыўнікам, але Аляксей і яго таварышы былі ўжо неўлавімы.

**Ф. П.**

## Шырэй прымяняць абстрэл варожых эшалонаў

Выконваючы загад таварыша Сталіна аб разбурэнні камунікацый праціўніка, партызаны нашага атрада шырока прымяняюць абстрэл варожых эшалонаў. З вінтовак і кулямётаў, з супроцьтанкавых ружжаў мы запальваем фашысцкія паравозы і вагоны, знішчаем жывую сілу праціўніка.

Днямі дзве групы нашых партызан пад камандаваннем тт. Адама Ц. і Івана М. накіраваліся на чыгунку ў паляванне за варожымі эшалонамі, ідучымі на фронт. Паляванне было ўдачным. У рэзультаце абстрэла выведзены са строю 2 паравозы, зрашэчаны 6 класных вагонаў з салдатамі і афіцэрамі. Вораг панёс вялікія страты.

Абстрэл варожых эшалонаў — важны сродак у партызанскай барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Яго трэба прымяняць ва ўсіх партызанскіх атрадах.

**Фёдар Д.** — партызан Н-скага атрада.

## Забілі 60 гітлераўцаў

Ні днём, ні ноччу не дае немцам спакою партызанскі атрад тав. Б. Кожная пядзь нашай зямлі, па якой прасоўваюцца фашысцкія драпежнікі, кожны прыдарожны кусцік нясе ім смерць.

Днямі стая нямецкіх ваўкоў рухалася ў напрамку вёскі М. Партызанская разведка аб гэтым хутка далажыла камандзіру атрада. Народныя мсціўцы падрыхтавалі падарункі для няпрошаных гасцей і заляглі ў кустах, чакаючы іх падыходу.

Як толькі гітлераўцы наблізіліся, па іх быў адкрыт дружны агонь. Прыступілі да работы партызанскія кулямёты, аўтаматы і вінтоўкі. Як скошаная трава, падалі на зямлю мёртвыя фрыцы. Да 60 гітлераўцаў было знішчана ў гэтым кароткім, але імклівым баю.

**Сідар П.** — партызан Н-скага атрада.

## Удары па камунікацыях ворага

Партызаны з атрада тав. В. узарвалі варожы эшалон, які ішоў на фронт. Разбіт паравоз і 10 вагонаў з тэхнікай і боепрыпасамі. 7 вагонаў пашкоджаны. Рух па чыгунцы быў спынен на 14 гадзін.

Група партызан з другога атрада таксама пусціла пад адкос нямецкі эшалон з аўтамашынамі і боепрыпасамі. Знішчан паравоз і 15 вагонаў.

## Жудасныя ўчынкі нямецкіх душагубаў

Ашуканствам, правакацыяй, атрутай хлусні „вэрбуюць" нямецка-фашысцкія нягоднікі на катаржныя работы ў Германію. Гэтым яны, аднак, не абмяжоўваюцца. Бандыты робяць аблавы, паляць цэлыя вёскі, забіраючы з сабой насельніцтва.

26 мая фашысцкія сцярвятнікі ўварваліся ў вёску Курычычы, Петрыкаўскага раёна. Пачалася жудасная расправа. Як ашалелыя шакалы, з пенай у роце ўрываліся немцы і іх блюдалізы ў хаты, выбівалі вокны, грабілі ўсё да ніткі, а потым запалілі вёску.

Трэск гарэўшых хат зліваўся з плачам жанчын і дзяцей. Абнаглелыя душагубы прыкладамі і бізунамі сагналі, як жывёлу ў табун, 356 чалавек і пагналі іх за сабой.

Такі-ж лёс пасягнуў і насельніцтва другіх населеных пунктаў. У вёсцы Бабунічы немцы спалілі 45 двароў і пагналі на нямецкую катаргу больш 50 чалавек, у вёсках Бабрэчча і Хусна — больш 70 чалавек.

**Васіль Д.**

## За граніцай

У афіцыяльнай заяве аб рэзультатах перагавораў паміж Рузвельтам і Чэрчылем, якія праходзілі ў Вашынгтоне, гаворыцца: „Нядаўнія перагаворы аб'еднаных штабаў у Вашынгтоне завяршыліся поўнай дагаворанасцю адносна будучых аперацый на ўсіх тэатрах вайны".

* * *

Кітайскія войскі пачалі контрнаступленне па ўсім фронце ўздоўж ракі Янцзы, на поўдзень ад Ічана. У раёне Ічана фактычна акружаны 5 японскіх дывізій.

Кітайскія войскі на франтах у Хэнані і ў Хунані аказваюць націск на японскія войскі з тым, каб падтрымліваць дзеянні кітайцаў у раёне Янцзы.

Рэдакцыйная калегія

Выданне Капаткевіцкага РК КП(б)Б